**Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне**
**Гісторыя Беларусі: другая палова 1940-х гг. — пачатак XXI ст.**
**XI клас**
**(базавы ўзровень)**
**(35 гадзін)**


1. История Беларуси: вторая половина 1940-х гг. — начало XXI в.: учеб. пособие для 11 кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / под ред. В.М. Фомина. — Минск: НИО, 2013.
2. Гісторыя Беларусі: другая палова 1940-х гг. — пачатак XXI ст.: вучэб. дапаможнік для 11 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / пад рэд. В.М. Фаміна. — Мінск: НІА, 2013.
3. Паноў, С.В. Ад БССР да Рэспублікі Беларусь: выбар шляхоў развіцця : 11 клас : дапаможнік для настаўнікаў / С.В. Паноў. — Мінск, 2010.
4. Паноў, С.В. Гісторыя Беларусі ў 11 класе: вучэб.-метад. дапаможнік для настаўнікаў / С.В. Паноў. — Мінск: Выд. цэнтр, 2015.
5. Панов, С.В. Сборник практических заданий для выпускного экзамена по учебному предмету «История Беларуси» за период обучения и воспитания на III ступени общего среднего образования: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / С.В. Панов, Н.Н. Ганущенко, Л.А. Ярошевич. — Минск: Аверсэв, 2017.
6. Паноў, С.В. Зборнік практычных заданняў да выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі» за перыяд навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі: дапаможнік для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С.В. Паноў, Н.М. Ганушчанка, Л.А. Ярашэвіч. — Мінск: Аверсэв, 2017.
7. Паноў, С.В. Гісторыя Беларусі: другая палова 1940-х гг. — пачатак XXI ст. 11 клас: рабочы сшытак: дапаможнік для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі / С.В. Паноў. — Мінск: Аверсэв, 2017.
8. История. 11 класс: рабочая тетрадь: пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования / М. А. Краснова [и др.]. — Минск: Аверсэв, 2016, 2017.
9. Фамін, В.М. Гісторыя Беларусі: другая палова 1940-х гг. — пачатак XXI ст.: 11 клас: хрэстаматыя / В.М. Фамін, С.В. Паноў, Т.Ф. Ходзіна. — Мінск, 2009.
10. Гінчук, В.В. Гісторыя Беларусі: тэставыя і рознаўзроўневыя заданні: 10—11 класы: дапаможнік для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В.В. Гінчук. — Мінск, 2012.


| № урока і дата правя-дзення | Тэма і асноўныя пытанні ўрока | Коль-касць гадзін | Мэты вывучэння ўрока | Характарыстыка асноўных відаў і спосабаў дзейнасці | Дамашняе заданне |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |

| Раздзел I. БССР у другой палове 1940-х — першай палове 1950-х гг. (6 г) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Пераадоленне наступстваў вайны. Выхад на новы ўзровень развіцця.**<br>1. Людскія і матэрыяльныя страты Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.<br>2. Матэрыяльнае становішча насельніцтва ў першыя пасляваенныя гады.<br>3. Пасляваеннае аднаўленне. Развіццё прамысловасці і транспарту ў гады чацвёртай пяцігодкі.<br>4. Працоўны подзвіг беларускага народа.<br>5. Курс на апераджальны рост цяжкай прамысловасці ў гады пятай пяцігодкі.<br>6. Меры па аднаўленні сельскай гаспадаркі | 1 | ***Вучні павінны ведаць:***<br>вызначэнні паняццяў: *пасляваеннае аднаўленне, рэпарацыі*;<br>асноўныя падзеі пасляваеннага дзесяцігоддзя Беларусі;<br>асноўныя кірункі пасляваеннага аднаўлення БССР у эканамічнай сферы;<br>асноўныя кірункі пасляваеннага аднаўлення БССР у грамадска-палітычнай сферы;<br>асаблівасці развіцця культуры.<br>***Вучні павінны ўмець:***<br>называць меры ўлад па аднаўленні сельскай гаспадаркі;<br>вызначаць асаблівасці аднаўленчага працэсу ў БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны;<br>характарызаваць асноўныя кірункі пасляваеннага аднаўлення БССР на шляху далейшай эканамічнай мадэрнізацыі;<br>характарызаваць асаблівасці пасляваеннага аднаўлення эканомікі пры дапамозе карты;<br>параўноўваць гістарычныя падзеі (працэсы): аднаўленчыя працэсы пасля грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны;<br>даказваць, што нашы суайчыннікі здзейснілі працоўны | *Работа з гістарычнымі дакументамі* (хрэстаматыя): дакумент № 8: вызначэнне асаблівасцей развіцця народнай гаспадаркі ў аднаўленчы перыяд; дакумент № 12: вызначэнне характэрных ры-саў развіцця прамысловасці БССР у першыя пасляваенныя гады.<br>*Работа з картасхемай* (вучэбны дапаможнік, с. 12): вызначэнне найбольш важных прамысловых прадпрыемстваў цяжкай і лёгкай прамысловасці, пабудаваных у БССР у першыя пасляваенныя гады.<br>Работа са статыстычнымі данымі: (вучэбны дапаможнік с. 16): вызначыць адметныя галіны прамысловасці ў выніку пасляваеннага аднаўлення | § 2.<br>*Індывідуальнае* (па выбары): падрыхтаваць паведамленні аб дзейнасці П.К. Панамарэнкі, К. В. Кісялёва, А.А. Грамыкі; *да ўрока «Наш край»* (па выбары): падрыхтаваць паведамленне «Развіццё эканомікі ў краі пасля Вялікай Айчыннай вайны» |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | подзвіг у час аднаўлення;<br>сінхранізаваць працэс пасляваеннага аднаўлення ў СССР і БССР з вызначэннем агульнага і асаблівага | | |
| 2 | **Грамадска-палітычнае жыццё БССР.**<br>1. Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця.<br>2. Месца Камуністычнай партыі Беларусі ў грамадска-палітычнай сістэме.<br>3. Роля Саветаў дэпутатаў працоўных, прафсаюзаў, камсамола ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. П.К. Панамарэнка. В.І. Казлоў.<br>*4. Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных канфесій.*<br>*5. Знешнепалітычная дзейнасць ураджэнца Беларусі А.А. Грамыкі* | 1 | ***Вучні павінны ведаць:***<br>вызначэнне паняцця *рэпатрыяцыя;*<br>асаблівасці аднаўленчай палітыкі ў заходніх абласцях.<br>***Вучні павінны ўмець:***<br>вызначаць асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця ў БССР у пасляваенныя гады;<br>характарызаваць ролю Саветаў дэпутатаў працоўных у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі;<br>характарызаваць ролю дзейнасці гістарычных дзеячаў: П.К. Панамарэнкі, В.І. Казлова, А.А. Грамыкі;<br>характарызаваць узаемаадносіны ўлады і рэлігійных канфесій | *Запаўненне табліцы* «Палітычная сістэма БССР» (1 сл. — палітычная партыя і яе арганізацыі; 2 сл. — роля ў грамадска-палітычным жыцці).<br>*Работа з гістарычным дакументам* (хрэстаматыя): дакумент № 4: характарыстыка адносін мясцовых жыхароў да рэпатрыянтаў | § 3, пыт. 1, 2, 4, 6.<br>*Індывідуальнае* (па выбары): падрыхтаваць паведамленне аб жыцці і дзейнасці В.Ф. Купрэвіча, Г.І. Сідарэнкі, У.І. Пічэты |
| 3 | **Адраджэнне і развіццё адукацыі і навукі ў БССР у пасляваенны перыяд.**<br>1. Аднаўленне агульнаадукацыйнай школы.<br>2. Вышэйшая і сярэдняя спецыяльная адукацыя Беларусі ў першыя пасляваенныя гады.<br>3. Адраджэнне і выхад | 1 | ***Вучні павінны ведаць:***<br>вышэйшыя навучальныя ўстановы БССР у першай палове 1950-х гг.;<br>дасягненні адукацыі і навукі, літаратуры і мастацтва ў пасляваенным аднаўленні БССР.<br>***Вучні павінны ўмець:***<br>вызначаць ролю адукацыі і | *Работа з картай, картасхемай* (вучэбны дапаможнік, с. 12): вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія былі адкрыты ці пачалі дзейнічаць у БССР у першай палове 1950-х гг.<br>*Запаўненне табліцы* «Развіццё адукацыі і навукі | § 4, пыт. 6, 8.<br>*Індывідуальнае* (па выбары): падрыхтаваць паведамленні аб творчасці ў гэты перыяд: А. Куляшова, П. Броўкі, |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | беларускай навукі на новыя рубяжы. В.Ф. Купрэвіч | | навукі ў аднаўленні народнай гаспадаркі і ўсяго жыцця рэспублікі;<br>вызначаць ролю адукацыі ў жыцці беларускай моладзі;<br>характарызаваць умовы пасляваеннага навучання;<br>характарызаваць дзейнасць дзеячаў навукі з апісаннем іх дасягненняў | БССР у 1920—1930-я гг. і ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе» (вучэбны дапаможнік, с. 33, пыт. 4).<br>*Работа з гістарычным дакументам* (хрэстаматыя): дакумент № 62 — вызначыць умовы пасляваеннага аднаўлення | М. Танка,<br>П. Панчанкі,<br>П. Глебкі;<br>*да ўрока «Наш край»* (па выбары): падрыхтаваць паведамленне «Развіццё адукацыі ў краі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе» |
| 4 | **Літаратура і мастацтва.**<br>1. Развіццё літаратуры.<br>2. Адлюстраванне тэмы Вялікай Айчыннай вайны і асвятленне мірнага жыцця Беларусі ў пасляваенныя гады ў творах беларускіх празаікаў і паэтаў. Я. Колас. Я. Брыль. М. Лынькоў. І. Мележ. І. Шамякін. Творчасць П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова.<br>3. Тэатр. Музычнае жыццё. Выяўленчае мастацтва | 1 | ***Вучні павінны ведаць:***<br>вызначэнні паняццяў: *метад сацыялістычнага рэалізму, прынцып партыйнасці.*<br>***Вучні павінны ўмець:***<br>вызначаць умовы развіцця беларускай літаратуры;<br>вызначаць дасягненні і цяжкасці ў развіцці беларускай літаратуры і мастацтва ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе;<br>вызначаць асноўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў галіне літаратуры і мастацтва;<br>характарызаваць творчасць дзеячаў культуры з апісаннем іх дасягненняў ці пазіцыі (адносін) да адлюстроўваемых гістарычных сюжэтаў;<br>раскрываць прычынна-следчую сувязь паміж кіруючай роллю КПБ і рэалізацыяй прынцыпу | *Запаўненне табліцы* «Асноўныя дасягненні ў развіцці культуры ў першы пасляваенны перыяд» (1 сл. — галіна культуры, 2 сл. — асноўныя дасягненні) або «Развіццё літаратуры» (1 сл. — пісьменнік, 2 сл. — творы).<br>*Вызначэнне* матываў творчасці беларускага паэта Аркадзя Куляшова.<br>*Тлумачэнне* матываў творчасці беларускага мастака Яўгена Зайцава як аўтара карціны «Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 г.» | § 5, пыт. 7; працяг запаўнення табліцы |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры і мастацтве | | |
| 5 | **Наш край.** | 1 | ***Вучні павінны ведаць:***<br>асноўныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі краю ў пасляваенны перыяд;<br>асаблівасці развіцця краю ў пасляваенны перыяд і фактары, якія іх абумовілі.<br>***Вучні павінны ўмець:***<br>канкрэтызаваць асноўныя тэндэнцыі развіцця Беларусі ў пасляваенны перыяд фактамі з гісторыі роднага краю;<br>працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі (матэрыялы краязнаўчага музея, гісторыка-дакументальная хроніка «Памяць») | Прадстаўленне вучнямі інфармацыі аб развіцці краю ў другой палове 1940-х — першай палове 1950-х гг., падрыхтаванай у выніку вывучэння раздзела I | Паўтарыць § 2—5.<br>*Індывідуальнае* (па выбары): падрыхтоўка паведамленняў (с. 41) |
| 6 | **Абагульненне да раздзела I.** | 1 | ***Вучні павінны ведаць:***<br>вызначэнні паняццяў па дадзеным раздзеле.<br>***Вучні павінны ўмець:***<br>характарызаваць асноўныя вынікі пасляваеннага аднаўлення БССР;<br>параўноўваць гістарычныя падзеі па прапанаваным ці самастойна выбраным прыкметам з вызначэннем агульнага і рознага;<br>раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж | *Варыянт I.* Работа з матэрыялам вучэбнага дапаможніка (§ 6, с. 39—41).<br>*Варыянт II.* Праверачная работа па раздзеле I | С. 41 (гістарычныя задачы).<br>*Індывідуальнае* (па выбары): вызначэнне тэмы праектнай дзейнасці (с. 111—112) |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | гістарычнымі падзеямі, з’явамі, працэсамі;<br>вызначаць ролю гістарычных асоб і дзеячаў культуры і характарызаваць іх дзейнасць | | |
| **Раздзел II. БССР у другой палове 1950-х — 1980-я гг. (11 г)** | | | | | |
| 7 | **Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.**<br>1. Змены ў грамадска-палітычным жыцці. Пачатак працэсу рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій.<br>2. Кіруючая роля камуністычнай партыі. Прыняцце курсу на будаўніцтва камуністычнага грамадства. К. Т. Мазураў.<br>3. Роля Саветаў дэпутатаў працоўных, камсамола, прафсаюзаў у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі | 1 | ***Вучні павінны ведаць:***<br>вызначэнне паняцця: *рэабілітацыя*.<br>***Вучні павінны ўмець:***<br>вызначаць характэрныя рысы грамадска-палітычнага жыцця ў БССР у другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.;<br>вызначаць змены ў грамадска-палітычным жыцці ў перыяд «хрушчоўскай адлігі»;<br>характарызаваць ролю камуністычнай партыі ў грамадска-палітычным жыцці;<br>характарызаваць палітыку дзяржавы ў адносінах да канфесій;<br>характарызаваць дзейнасць гістарычных дзеячаў | *Работа па складанні лагічнага ланцужка*: раскрыць прычынна-выніковую сувязь паміж курсам ХХ з’езда і аздараўленнем палітычнай атмасферы ў грамадстве.<br>*Работа з гістарычнымі дакументамі* (хрэстаматыя): дакумент № 47, 48: характарыстыка палітыкі дзяржавы ў адносінах да канфесій;<br>дакумент № 52: характарыстыка выбараў у Саветы народных дэпутатаў | § 8. *Індывідуальнае* (па выбары): падрыхтаваць паведамленне аб жыцці і дзейнасці К.П. Арлоўскага;<br>*да ўрока «Наш край»* (па выбары): падрыхтаваць паведамленне «Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных канфесій у краі» |
| 8 | **Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.**<br>1. Фарміраванне прамысловага комплексу ў БССР. Развіццё машынабудавання і металаапрацоўкі, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці.<br>2. Вынікі развіцця сельскай | 1 | ***Вучні павінны ведаць:***<br>вызначэнні паняццяў: *урбанізацыя, меліярацыя, валюнтарызм;*<br>ведаць галіны прамысловасці ў БССР, звязаныя з разгортваннем НТР;<br>асноўныя кірункі паляпшэння матэрыяльнага становішча | *Работа па складанні ментальнай карты (схемы):* «Сацыяльна- эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.».<br>*Работа з гістарычнай картай*: вызначыць уплыў, якія аказалі крыніцы сыравіны і | § 9, пыт. 1—2. *Індывідуальнае* (па выбары): падрыхтаваць паведамленне аб дзейнасці П.М. Машэрава |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | гаспадаркі рэспублікі.<br>К.П. Арлоўскі.<br>3. З’яўленне новых гарадоў і жыллёвае будаўніцтва. Умовы жыцця сельскага і гарадскога насельніцтва | | насельніцтва БССР.<br>***Вучні павінны ўмець:***<br>характарызаваць пры дапамозе гістарычнай карты эканамічнае развіццё ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг;<br>характарызаваць вынікі развіцця сельскай гаспадаркі рэспублікі;<br>вызначаць характэрныя супярэчнас- ці сацыяльна-эканамічнага развіцця;<br>характарызаваць умовы паляпшэння жыцця насельніцтва БССР | геаграфічнае месцазнаходжанне рэспублікі на размяшчэнне новабудоўляў 1950-х — першай паловы 1960-х гг. у БССР.<br>*Аналіз статыстычных даных* (вучэбны дапаможнік, с. 60): зрабіць выснову, аб чым сведчаць даныя табліцы «Рост жыллёвага фонду ў БССР» | |